Ірына ХАМУТОВА
*(г. Мінск)*

# СУЧАСНАЯ ПРАКТЫКА АДНАЎЛЕННЯ, ЗАСВАЕННЯ І ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ ТРАДЫЦЫЙНАГА МАСТАЦТВА ВА ЎСТАНОВАХ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВА

У гэтым артыкуле я распавяду аб сучаснай практыцы аднаўлення традыцыйнага мастацтва ва ўстановах культуры і адукацыі на прыкладзе дзіцячага фальклорнага гурта «Мілавіца» Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Ветразь», які знаходзіцца ў Кастрычніцкім раёне г. Мінска. Гэты гурт займаецца актыўнай рэвіталізацыяй фальклору, у тым ліку і музычнага.

Фальклорны гурт «Мілавіца» пад кіраўніцтвам Марыі Васільеўны Снітко быў створаны ў 1991 г. Праграмай яго прадугледжаны збор песень сваёй малой радзімы – в. Грыцкавічы, якая знаходзіцца ў Крупскім раёне Мінскай вобласці.

«Мілавіца» складаецца з трох узроставых груп і сямейнага клуба «Стрэчанне». Песні, якія спяваюць дзеці, залежаць ад іх узроста. Марыя Васільеўна з кожнай узроставай групай вывучае адпаведны матэрыял, які бытаваў у традыцыі.

Першая ступень – «Зярняткі». У гэтай групе дзеці ад чатырох да сямі гадоў. З малымі Марыя Васільеўна спявае дзіцячыя народныя песні, напрыклад, «Кукарэку, петушок», «Чубаценькі верабей», «Козачка», працуе з забаўлянкамі «Кую, кую ножку», «Белабока-сарока», «Ладачкі-ладкі» і інш. Яшчэ спяваюць дзіцячыя прыпеўкі і калыханкі («Псік, коцік, пад масток», «Люля, люля, люляшу»). Пад час выканання калыханак хлопчыкі і дзяўчаткі выбіраюць сабе ляльку. І, такім чынам, гуляючы ў лялькі і спяваючы ім, дзеці незаўважна для сябе далучаюцца да традыцыйнай беларускай культуры. Кіраўнік гурта навучае малых традыцыйным дзіцячым гульням «У зайца», «Жгутка», «Пячэнне хлеба», «Мышка», «Кот-катафей», «У птушак». Ім гэта даспадобы і з прыемнасцю прыходзяць на наступны занятак.

Другая ступень – «Парасткі». Гэта ўзроставая група складаецца з юнакоў васьмі–адзінаццаці гадоў. Марыя Васільеўна далучае іх да каляндарнай абраднасці. Усе песні прынцыпова развучваюцца і выконваюцца ў адпаведную пару года.

Трэцяя ступень – «Журавінкі». У гэтай групе займаецца моладзь дванаццаці–васямнаццаці гадоў. У гэтым узросце яскрава бачна ўзаемадзеянне хлопцаў і дзяўчат. На дапамогу стасункам Марыя Васільеўна навучае традыцыйным гульням моладзь, напрыклад, калядным гульням «Явар», «Яшчур», «У казла», ці ў восеньскую гульню «Шастак». З моладдзю кіраўнік

развучвае акрамя каляндарных яшчэ і сямейна-побытавыя песні. Напрыклад, у 2016 г. была зроблена рэканструкцыя абрада «Традыцыйнае вяселле» в. Грыцкавічы. Яшчэ моладзь з задавальненнем спявае лірычныя песні. Марыя Васільеўна дазваляе кожнаму салісту выбраць сабе песню для душы.

Чацвёртая ступень – сямейны клуб «Стрэчанне». У ім займаюцца дарослыя, у тым ліку бацькі тых дзетак, якіх яны прыводзяць у дзяцячы фальклорны гурт «Мілавіцца», каб далучыць і іх да традыцыйнай беларускай культуры. Тут вывучаецца як каляндарна-абрадавая, так і сямейна-абрадавая творчасць. Часта можна пачуць песні аб жаноцкай долі, альбо рэкруцкія.

У першаю чаргу «Мілавіца» прываблівае правільным падыходам кіраўніка гурта Марыі Васільеўны Снітко да выхавання дзяцей і моладзі сродкамі традыцыйнай беларускай культуры. У межах этнакультурнага выхавання адбываецца, фактычна, духоўнае ўдасканаленне асобы шляхам развіцця творчых здольнасцей дзіцяці сродкамі этнічнага мастацтва – фальклору яго этнаса. Марыя Васільеўна да кожнага чалавека знаходзіць асабісты падыход. Для яе важна тое, каб дзеці адчулі, што ў кожным момант іх жыцця ўдзельнічае кіраўнік.

Па-другое, яе крэда – ніколі не патрэбна нервавацца перад дзецьмі і павышаць на іх голас, трэба размаўляць спакойна, ціха, мякка. У калектыў яны прыходзяць займацца любімай справай, таму размоў на павышаных танах катэгарычна не можа быць.

У фальклорным гурце «Мілавіца» перайманне песеннага фальклору адбываецца толькі «з вуснаў у вусны». Марыя Васільеўна да гэтага ставіцца прынцыпова, таму ніколі не дазваляе запісваць тэксты песен на паперу, а потым вучыць, бо пры такім падыходзе губляецца інтанацыя і характар песні, якія ўклаў у яе народ.

Яшчэ удзельнікі гурта пераймаюць традыцыйны беларускі побытавы танец ад этнахарэографа Мікалая Аляксеевіча Козенкі. Спосаб пераймання – «з нагі ў нагу». Дзяцей навучаюць імправізаваць. У імправізаваных танцах, такіх як «Барыня», «Полька» і інш., асабліва адчуваюцца стасункі партнёраў.

Таксама ў «Мілавіцы» Алеся Аляксандраўна Герашчанка навучае іграць на народных музычных інструментах, такіх як барабан, скрыпка, бубен, гармонік, дудка, акарына і інш. Дзяцей не навучаюць музычнай грамаце. Перайманне адбываецца ад кіраўніка ансамбля на слых, так як было ў вёсцы. У рэпертуары выключна традыцыйныя найгрышы, танцавальныя, гульнявыя, песенныя.

Аднаўленне, засваенне і папулярызацыя фальклора ў Мінску актыўна адбываецца, дзякуючы ўдзелу моладзі ў шматлікіх конкурсах, якія заснаваў Мікалай Аляксеевіч Козенка. Фальклорны гурт «Мілавіца» актыўна прымае ў іх удзел.

Ужо чатыры гады як ладзіцца ў Кастрычніцкім раёне г. Мінска адкрыты конкурс выканаўцаў беларускіх народных танцаў «Ветразь». У ім штогод удзельнічае гурт «Мілавіца». Усе ўдзельнікі паказваюць на ім сапраўдныя побытавыя танцы і абменьваюцца варыянтамі на майстар-класах.

Вусная народная творчасць з'яўляецца важнай і неад'емнай часткай духоўнай культуры народа. Таму ў 2017 г. быў створаны раённы конкурс апавядальнікаў беларускай народнай прозы. Удзельнікі дэманструюць празаічныя эпічныя творы. Такім чынам гарадскія жыхары далучаюцца да культурнай спадчыны сваіх продкаў.

Яшчэ 24 студзеня 2018 г. адбыўся першы адкрыты конкурс народнага спеву і музычна-інструментальнага выканальніцтва «Згукі мінуўшчыны». У ім удзельнікі дэманстравалі абрадавыя народныя песні, якія з'яўляюцца найбольш старым пластом традыцыйнай культуры. Конкурс прайшоў у адной школе Мінска. Навучэнцаў яе ён моцна зацікавіў, таму яны на перапынку актыўна прымалі ўдзел у майстар-класе па традыцыйных танцах і гульнях, які праводзіў гурт «Мілавіца».

У фальклорным гурце «Мілавіца актыўна адбываецца аднаўленне, засваенне і папулярызацыя традыцыйнага мастацтва. Дзякуючы кіраўніку гурта, якая аднаўляе абрады сваёй малой радзімы і дэманструе іх, напрыклад, у Тэатры юнага гледача, Нацыянальным мастацкім музеі, ці музеі архітэктуры і побыту «Строчыцы» (в. Азярцо), музейна-гістарычным комплексе Дудуткі, якія знаходзяцца ў Мінскім раёне, а таксама на шматлікіх іншых пляцоўках Мінска адбываецца трансляцыя фальклору.

Вольга ХАЧКОВА
*(г. Мінск)*

## ФАЛЬКЛОРНАЯ СПАДЧЫНА МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ: КРОКІ ДА АДНАЎЛЕННЯ

Мінская вобласць – даволі спецыфічны культурна-гістарычны рэгіён. Наяўнасць старажытных гарадоў і мястэчак (Слуцк, Барысаў, Нясвіж, Капыль і інш.) дазваляе гаварыць аб багатым пласце культурнай спадчыны Цэнтральнай Беларусі – з аднаго боку, а буйныя прамысловыя цэнтры абумоўліваюць знікненне зацікаўленасці і патрэбы ў традыцыйных формах мастацтва сярод моладзі, асабліва ў гарадах – з іншага боку. На перакрыжаванні гэтых супярэчнасцей і развіваецца традыцыйная культура Міншчыны.

У канцы 80-х – пачатку 90-х гг. XX ст. сярод насельніцтва Беларусі значна ўзрастае цікавасць да традыцыйнага мастацтва: распрацоўваюцца доўгатэрміновыя мэтавыя праграмы падтрымкі і развіцця народнай творчасці, прымаецца Закон Рэспублікі Беларусь «Аб народным мастацтве, народных